**Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі**
**“Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”**

# Сучасныя формы работы грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў вакальнай студыі з выкарыстаннем рэгіянальнага кампанента

Рэкамендавана
педагагічным саветам  дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”

ад 17 лютага 2021г., пратакол №1

**Сучасныя формы работы грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў вакальнай студыі з студыі выкарыстаннем рэгіянальнага кампанента** / Т.І.Суднік, Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі. – Докшыцы. – 2021. – с.

У зборніку прадстаўлены вопыт работы педагога дадатковай адукацыі па выкарыстанню сучасных форм работы па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў узорнай вакальнай студыі “Тоніка” на прыкладзе стварэння відэакліпа беларускай народнай песні.

Рэкамендуецца  педагогам дадатковай адукацыі музычнага профілю вакальнага напрамку.

©Дзяржаўная ўстанова
дадатковай адукацыі
“Докшыцкі раённы цэнтр
дзяцей і моладзі”

**Змест**

1. Уступ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2

2. Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне сродкамі вакальнага мастацтва. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

3. Відэакліп як адна з сучасных форм грамадзянска-патрытычнага выхавання ў вакальнай студыі . . . . . . . . . . . . . . 9

4. Заключэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

5. Літаратура і інфармацыйны рэсурс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15

6. Дадатак 1. Тэкст баларускай народнай песні “Пайшла Марта”. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16

## Уступ

*“Дзяржава мае магчымасць расквітаць, калі ў ёй створаны*
*ўмовы для патрыятычнага выхавання пакалення”*
*М.Гусоўскі*

Нікога не трэба запэўніваць у тым, што ў сучасных умовах грамадзянска-патрыятычнае выхаванне з’яўляецца адной з галоўнейшых задач, якія стаяць перад грамадствам.

У наш даволі жорсткі час, у час, калі часта галоўныя чалавечыя каштоўнасці абясцэньваюцца, выцясняюцца матэрыяльнымі, калі існуе шмат інфармацыіі пра жорсткасць і насілле, на перш план грамадзянска-патрыятычнага выхавання выходзіць неабходнасць фарміравання асобасных маральна-духоўных якасцяў, з якіх пачынаецца грамадзянскае станаўленне кожнага чалавека. Толькі чалавек, які валодае лепшымі агульначалавечымі якасцямі, які адчувае прыналежнасць да свайго роду, сям’і, да сваёй малой Радзімы, да краіны, дзяржавы і грамадства, ўсяго, што адбываецца навокал, які адчувае  цікавасць і павагу да гістарычнай і культурнай спадчыны, роднай мовы, можа лічыцца сапраўдным грамадзянінам і патрыётам. Станаўленню асобы  дзіцяці, здольнай у будучым заняць дастойнае месца ў жыцці грамадства, неабходна педагагічная падтрымка. Як гаварыў Д.С.Ліхачоў, “да патрыятызму нельга толькі прызываць, яго трэба клапатліва выхоўваць”. Вялікія магчымасці ў дадзеным накірунку ва ўмовах ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі маюць аб’яднанні па інтарэсах мастацкага профілю, заняткі ў якіх, у першую чаргу, спрыяюць фарміраванню духоўнага багацця дзіцяці.

## Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне сродкамі вакальнага мастацтва

Патрыёт… Што ж гэта значыць? Я часта задаю сваім навучэнцам пытанне, у чым яны бачаць сэнс гэтага слова. І адразу атрымліваю адказ: “Чалавек, які любіць сваю Радзіму”. Гэта першае, што гавораць дзеці. А потым: “Які ведае сваю гісторыю і культуру сваёй краіны”, “Які добрае валодае роднай мовай”, “Духоўна багаты чалавек”… Пачуццё Радзімы пачынаецца ў дзіцяці з адносін да сям’і, да блізкіх людзей. А задача педагогаў заключаецца ў тым, каб стварыць найбольш дзейсную сістэму патрыятычнага выхавання дзяцей і падлеткаў, вызначыць напрамкі і метады, якія дапамогуць афарміраваць у падрастаючага пакалення пачуццё прыналежнасці да беларускага грамадства, дзяржавы, сфарміраваць грамадзянскую пазіцыю і лепшыя маральныя якасці.

Вялікія магчымасці для развіцця важных маральных якасцяў асобы, яе каштоўнасных арыентацый і духоўных запатрабаванняў у сістэме дадатковай адукацыі мае музычнае выхаванне. У працэссе ўздзеяння на эмацыянальную сферу дзяцей пры дапамозе зместу і сродкаў музычнай выразнасці паскараецца фарміраванне маральна-духоўных якасцяў і грамадзянскіх перакананняў.

Вакальная студыя “Тоніка” была створана ў 2006 годзе.У кастрычніку 2014 года студыі было прысвоена званне “Ўзорны”. Асноўная мэта: стварэнне ўмоў для творчага развіцця асобы дзіцяці праз навучанне вакальнаму мастацтву. Галоўным напрамкам фарміравання патрыятычных пачуццяў у працэсе вакальнай падрыхтоўкі з’яўляецца выхаванне на лепшых узорах музычнага мастацтва.Аснову рэпертуару складаюць творы беларускіх і замежных аўтараў. Нягледзячы на тое, што асноўны напрамак работы студыі – гэта эстрадныя спевы, важнае месца ў адукацыйным працэсе адводзіцца народнай песні.

У вакальнай студыі “Тоніка” грамадзянска-патрыятычнае выхаванне пачынаецца ў падрыхтоўчай групе з фрагментаў беларускіх народных песень, якія выкарыстоўваюцца для распеванія. У нашым, у асноўным рускамоўным грамадстве, нават гэта суправаджаецца пэўнымі цяжкасцямі. Крок за крокам, ад занятку да занятку прыходзіцца ўпэўніваць, что наша мова адна з самых мяккіх і прыгожых моў свету, што нашы нацыянальныя традыцыі і абрады маюць такую ж культурную каштоўнасць, як і традыцыі любой еўрапейскай краіны. І гэтыя планамерныя і паслядоўныя крокі ў хуткім часе даюць свае вынікі. Ужо на другім годзе навучання з’яўляюцца песні беларускіх аўтараў на роднай мове. Мы звяртаемся да жыцця і творчасці паэтаў і кампазітараў, якія нарадзіліся на Докшыччыне. А докшыцкая зямля стала калыскай вядомых

кампазітараў. Таму адным з рэгіянальных кампанетаў адукацыйнай дзейнасці вакальнай студыі зя'ўляецца знаёмства з жыццём і творчасцю знакамітых землякоў: кампазітара, паэта і перакладчыка Дукельскага Уладзіміра Аляксандравіча, кампазітара, паэта, этнамузыкаведа і палітычнага дзеяча Каруза Паўла Іосіфавіча, аўтараў аркестровай, вакальнай і камерна-інструментальнай музыкі братоў Эміля, Мар'яна і Станіслава Наско, аўтара музыкі Гімна Рэспублікі Беларусь Нестара Сакалоўскага. І таму невыпадковыя ў рэпертуары нашага калектыву творы аўтараў-землякоў. Мы развучылі песню М.Наско на словы У.Карызны "Школьны вальс".

А на трэцім годзе навучання дзеці асэнсавана выбіраюць беларускі варыянт песні В.Каваліва "Смехапад", таму што, па іх меркаванню, на рускай мове яна гучыць не так мякка, звока і прыгожа. І калі гэты этап пройдзены, у дзяцей не ўзнікае адчуджэння ў адносінах да беларускіх песень. У далейшым выбар рэпертуару залежыць толькі ад таленту аўтараў твораў і магчымасцей вакальнай групы. Калі ва ўдзельнікаў ансамбля з'яўляюцца навыкі трох і чатырохгалоснага выканання, у рэпертуары з'яўляюцца больш складаныя творы, у тым ліку і аўтараў-землякоў, такія як: "Жураўлі на Палессе ляцяць" (на словы паэта-земляка Алеся Ставера) і аранжыроўкі беларускіх народных песень, створаныя прафесійнымі кампазітарамі. Вакальная студыя "Тоніка" выконвала такія народныя песні, як: "Кучарочкі шчэ й малыя", "Каза", "Па лужкам, лужкам", "За рэчкаю, за ракой", "Бярозанька", "Пайшла Марта". Вялікая ўвага заўсёды ўдзяляецца якасці выканання, таму што народную песню выконваць пасрэдна недапушчальна. У ёй адлюстравана ўся душа нашага народа.

У працэсе работы сфарміраваліся крытэрыі эфектыўнага правядзення заняткаў па патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў. Гэта: развіццё інтарэса да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; выхаванне самапавагі і пачуцця павагі да людзей; улік узроставых асаблівасцей; выхаванне пачуцця абавязку, калектывізму; забеспячэнне тэхнічнымі сродкамі і нагляднымі матэрыяламі.

Узровень сучаснага педагога дадатковай адукацыі не павінен адставаць ад узроўню сучаснага навучэнца. Для гэта педагогу неабходна уменне карыстацца не толькі сінтэзатарм, мікшэрным пультам, мікрафонамі, але і кампьютарам, Інтэрнэтам, праграмным забеспячэннем, прымяняць на практыцы сучасныя адукацыйныя тэхналогіі. Выкарыстанне інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій на занятках вакалам актывізуе пазнаваўчую дзейнасць навучэнцаў, павышае іх матывацыю да навучання, дазваляе выйсці за прывычныя рамкі і паглыбіць яго змест. Галоўная задача педагога па вакалу – пастаноўка голаса, фарміраванне і развіццё пеўчых і слыхавых навыкаў, ўяўлення пра правільнае гучанне, якое ажыццяўляецца на аснове

гукавога паказу, славеснага апісання і ацэнкі таго, што атрымалася, педагогам. Аднак, вакаліст не можа ў поўнай меры ацаніць сваё выкананне, свае паводзіны і рух на сцэне. А такія тэхнічныя сродкі, як кампьютар, відэакамера, планшэт, смартфон, дапамагаюць педагогу ў фарміраванн патрэбных уяўленняў. Пры гэтым навучэнец мае магчымасць пачуць свойй голас збоку, убачыць увасабленне мастацкага замыслу і вобразу, а, галоўнае, ацаніць яго разам з педагогам, дапамагае ўбачыць памылкі. Такі прагляд і праслухоўванне развівае ў дзяцей здольнасці да самааналізу і самакантролю.

Наяўнасць інтэрнэта і камп’ютара (смартфона) практычна ў кожнага навучэнца дапамагае педагогу мабільна даводзіць да навучэнцаў неабходную інфармацыю, мець зносіны з бацькамі, абмяркоўваць паўсядзённыя пытанні.

Узровень сучаснага педагога дадатковай адукацыі не павінен адставаць ад узроўню сучаснага навучэнца. Для гэта педагогу необходна уменне карыстацца не толькі сінтэзатарм, мікшэрным пультам, мікрафонамі, але і кампьютарам, Інтэрнэтам, праграмным забеспячэннем, прымяняць на практыцы сучасныя адукацыйныя тэхналогіі. Выкарыстанне інфармацыйна-камп’ютарных тэхналогій на занятках вакалам актывізуе пазнаваўчую дзейнасць навучэнцаў, павышае іх матывацыю да навучання, дазваляе выйсці за прывычныя рамкі і паглыбіць яго змест. Галоўная задача педагога па вакалу – пастаноўка голаса, фарміраванне і развіццё пеўчых і слыхавых навыкаў, ўяўлення пра правільнае гучанне, якое ажыццяўляецца на аснове гукавога паказу, славеснага апісання і ацэнкі таго, што атрымалася, педагогам. Аднак, вакаліст не можа ў поўнай меры ацаніць сваё выкананне, свае паводзіны і рух на сцэне. А такія тэхнічныя сродкі, як кампьютар, відэакамера, планшэт, смартфон, дапамагаюць педагогу ў фарміраванн патрэбных уяўленняў. Пры гэтым навучэнец мае магчымасць пачуць свойй голас збоку, убачыць увасабленне мастацкага замыслу і вобразу, а, галоўнае, ацаніць яго разам з педагогам, дапамагае ўбачыць памылкі. Такі прагляд і праслухоўванне развівае ў дзяцей здольнасці да самааналізу і самакантролю.

Наяўнасць інтэрнэта і камп’ютара (смартфона) практычна ў кожнага навучэнца дапамагае педагогу мабільна даводзіць да навучэнцаў неабходную інфармацыю, мець зносіны з бацькамі, абмяркоўваць паўсядзённыя пытанні.

Неабходнымі ўмовамі для грамадзянска-патрыятычнага выхавання з’яўляюцца: спрыяльны мікраклімат на занятках; змест вучэбнага матэрыялу; міжпрадметныя сувязі; паэтапная змена дзейнасці.

Усё гэта спрыяе прывіццю дзіцяці асноўных агульначалавечых каштоўнасцей, норм паводзін, ўзбагачэнню яго свядомасці і мыслення. І калі гэта адбываецца, то з дапамогай калектыва, а ў нашым выпадку – вакальнага калектыва – ён сам становіцца прапагандыстам народнай песні, роднай мовы,

шчырай любві да Радзімы. А асэнсаваныя беражлівыя адносіны да сваёй культуры, звычаяў, гісторыі, клопат пра сваю сям'ю, справы калектыва, жаданне прыносіць карысць людзям – гэта і ёсць вынік грамадзянска-патрыятычнага выхавання. А выкарыстанне рэгіянальных асаблівасцей і магчымасцей з'яўляецца важным кампанентам адукацыйнага працэсу.

Мы нават заўважылі, што многія міжнародныя конкурсы скіраваны на захаванне рэгіянальных традыцый. Няўжо гэта не пачуццё патрыятызму, калі дзеці з гонарам гавораць, што яны з Беларусі, з невялікага горада Докшыцы?

Яркай ілюстрацыяй і пацверджаннем гэтага можа служыць старонка з вакальнага конкурсу Міжнароднага дзіцячага творчага фестывалю “Феерверк талентаў” ў Балгарыі, які быў арганізаваны ў лагеры Тын Палас у жніўні 2018 года. Дарэчы, у журы быў запрошаны вядомы спявак Дзімітр Панчаў. Атрымалася так, што мы павінны былі выконваць сваю песню ў народным блоку, дзе выступалі харэаграфічныя калектывы з Грузіі.Неверагодныя касцюмы, кінжалы. Здавалася, што ад іх тэмпераменту ўспыхне сцэна. Гэта было захапляючае відовішча! Выходзіць на сцэну пасля такога выступлення было складана, хоць харэаграфічны калектыў і не з'яўляўся нашым сапернікам.



Мае навучэнцы ніколі больш не спявалі беларускую народную песню “Кучарочкі шчэ й малыя” так магутна і эмацыянальна, з такім энтузіазмам і ўздымам, як тады.



І ў выніку ў сваёй узроставай катэгорыі мы былі ўзнагароджаны дыпломам І ступені. Было вельмі прыемна, але месца не галоўнае, галоўнае – дзеці з'ядналіся ў агульным парыве, жаданні паказаць усю прыгажосць і адметнасць менавіта нашай беларускай народнай песні. Пасля конкурсу дзеці доўга абмяркоўвалі сваё выступленне і нумары іншых удзельнікаў, гаварылі, што вельмі хацелі, каб нас запомнілі і ведалі, што мы з Беларусі. А гэта многага каштуе.




**Відэакліп як адна з сучасных форм**
**грамадзянска-патрытычнага выхавання ў вакальнай студыі**

Гаворачы пра нацыянальную самасвядомасць і патрыятычныя пачуцці нельга не адзначыць важную ролю народнага фальклору, краязнаўства. Вакальная студыя "Тоніка" не займаецца пашуковай і даследчай дзейнасцю. У нас не было ніводнай фальклорнай экспедыцыі, аднак мы вывучаем звычаі і традыцыі нашага народа на аснове сабранага і апрацаванага вядомымі фалькларыстамі песеннага матэрыялу. Адчуць жывую сувязь са спадчынай продкаў дапамагае наведванне этнаграфічных музеяў. Аднойчы мы былі на экскурсіі ў этнаграфічнай вёсцы ў Польшы, недалёка ад горада Сандамеж. Была магчымасць параўнаць гісторыю і побыт дзвюх культур – беларускай і польскай. Нашы дзеці ўразілі экскурсавода сваімі ведамі. Вельмі часта чуліся іх выказванні: "Гэта ёсць у маёй прабабулі", "Гэта ёсць у нашым музеі". Асабліва кранула вось гэта – "у нашым музеі". У горадзе Докшыцы няма этнаграфічнага музея, але затое ён ёсць у вёсцы Гліннае, якая знаходзіцца прыкладна ў 15 кіламетрах ад райцэнтра. І мы, канечне ж, там пабывалі. Гісторыя стварэння музея пачалася са школьнай выставы работ народных умельцаў. Паступова калекцыя папаўнялася: у ёй з'явіліся старажытныя прылады працы, саматканыя посцілкі, рушнікі, адзенне. У 1990 годзе было прынята рашэнне аб стварэнні музея. Сёння ён размешчаны ў асобным памяшканні, якое знаходзіцца на тэрыторыі двара мясцовай школы. Знешні выгляд максімальна набліжаны да віду беларускага жытла канца 19 і ў пачатку 20 стагоддзя. Музей з'яўляецца месцам далучэння маладога пакалення да вывучэння набыткаў багатай матэрыяльнай і духоўнай

спадчыны нашага народа. Вось і для нас музей стаў крыніцай духоўнасці, з якой чэрпаюць сілы і натхненне.

Ідэя супрацоўніцтва ўзнікла ў працэсе работы над партытурай жартоўнай беларускай песні “Пайшла Марта”. Хацелася спалучыць тэхнічныя магчымасці 21 стагоддзя і асаблівы каларыт і духоўнасць канца 19 стагоддзя. 19. Намі было прынята рашэнне аб стварэнні музычнага кліпа.

З Вікіпедыі мы ведаем, што відэакліп, відэаролік або проста кліп (з англійскай мовы clip) – гэта непрацяглая ў часе па-мастацку састаўленая паслядоўнасць кадраў. Відэакліпы найбольш часта прымяняюцца для рэкламы тавараў і паслуг і для візуальнага суправаджэння аудыёкампазіцый на тэлебачанні. А музычныя відэакліпы прадназначаны для ілюстрацыі песні ці музычнай кампазіцыі і ўпершыню з’явіліся яшчэ ў пачатку XX стагоддзя, а з распаўсюджаннем тэлебачання сталі неад’емнай часткай прафесійнай дзейнасці артыстаў. Іх здымаюць прафесійныя рэжысёры-кліпмэйкеры. Іншая справа, што сучасная культура асобных відэакліпаў выклікае пытанні. Аднак нельга не пагадзіцца з тым, што якасныя і арыгінальня кліпы адыгрываць вялікую ролю ў стварэнні іміджу, папулярнасці музычнай кампазіцыі і выканаўцы. Яны маюць свайго гледача ў інтэрнэт-прасторы, а сетка-інтэрнэт для сучаснай моладзі вельмі прыцягальная. Сучасны педагог павінен быць са сваімі навучэнцамі на адной хвалі. І чаму б не выкарыстаць магчымасці інтэрнэта для выхаваўчых мэт?

Узяўшы на ўзбраенне інтэрактыўныя метады навучання, для якіх галоўнае – гэта стварэнне ўмоў для ініцыятывы дзяцей, была распачата работа над стварэннем відэакліпа. Тым больш, што вакальная работа над песняй была завершана. Ужо адбылося не адно выступленне на сцэне. Спачатку быў складзены сцэнарый кліпа ў выглядзе плана:

1. Едзем ў госці;
2. Прывітанне (“Добры вечар у хату”);
3. Запрашэнне у хату. Старэйшыя дзяўчынкі запрашаюць на вечарыну “Заходзьце, госці”);
4. Навіны сяла (“А вы чулі?);
5. Пад акенцам (“Хто гэта там?”, “Чаму нас не пазвалі?”);
6. Прыход новых гасцей (“А мы не з пустымі рукамі”);
7. Вечарына;
8. Выхад на двор;
9. Гульні на двары.

Калі аранжыроўка была гатова, партытура вывучана, сцэнарый прадуманы, касцюмы падрыхтаваны, наступіў доўгачаканы момант. Мы адправіліся ў этнаграфічны музей. Дапамаглі нам у гэтым педагогі цэнтра, і,

канечне ж, бацькі. А гэта так важна у працэсе  важнай для нас справы адчуваць падтрымку сям'і. Усе праблемы, якія ўзнікалі па ходу здымкаў, здаваліся не такімі важнымі, малазначнымі.

Калі мы пераступілі парог музея, то адразу апынуліся ў другім вымярэнні, дзе няма ні смартфонаў, ні наўтбукаў, айфонаў, фэйсбука, інстаграма… нават святла не было. А побач з намі былі розныя прадметы сялянскага жыцця, вырабы народных промыслаў і рамёстваў. У хаце – печ к аснова жыцця, чырвоны кут зх іконай, пакрытай рушніком, як духоўны цэнтр сям'і.





І ў дзяцей спрацавала генетычная памяць. Ім было вельмі камфортна, утульна ў гэтай хаце, што нават самыя сарамлівыя і сціплыя дзеці пасмялелі, разняволіліся і праявілі сябе добрымі артыстамі. Не, яны не выконвалі ролі. Яны жылі ў гэтай хаце, яны жылі гэтай песняй. Спатрэбіліся булачкі, узятыя

для рэквізіту, вараня бульба з салам, яблыкі. Нават чорны хлеб здаваўся смачным няўяўным дэлікатэсам. Усе былі вельмі задаволеныя здымкамі, пражытым днём, самімі сабой. Працэс здымкі аказаўся вельмі захапляючым. Атрымалася сапраўдная творчая каманда юных сцэнарыстаў, рэжысёраў і артыстаў.





Вядома, што калектыўная творчасць па-ранейшаму з’яўляецца найбольш актульным напрамкам у сацыяльна-педагагічнай практыцы сучаснага грамадства. Тэхналогія калектыўна-творчай дзейнасці аказалася небходнай, карыснай і дзейснай.У працэсе работы над кліпам студыйцы вучыліся працаваць у камандзе, паважаць чужое меркаванне, праяўляць талерантнасць да іншага пункту гледжання, вучыліся фарміраваць уласны погляд, заснаваны на пэўных фактах, змаглі паспрабаваць сябе ў новым

амплуа. Агульная калектыўная дзейнасць адыгрывае функцыю яднання, вучыць уземаразуменню, развівае пачуццё адказнасці за сябе і калектыў у цэлым, вучыць дабівацца пастаўленай мэты, быць актыўным, ініцыятыўным, творчым.  А гэта якасці, якія фарміруюць у дзяцей і падлеткаў жыццёвыя каштоўнасныя арыенціры і адносіны, якія ў будучым будуць вызначаць іх паводзіны  ў грамадстве, і якія з’яўляюцца вельмі неабходнымі сапраўднаму грамадзяніну сваёй краіны.

Станоўчым вынікам дадзенай формы работы можна лічыць і выніковы ўдзел нашага відэакліпа “Пайшла Марта” ў міжнародных конкурсах:

- III Міжнародны шматжанравы фестываль творчасці “Белавежская зорка” – дыплом дыпламанта I ступені (2020 год)
- XII Міжнародны дыстанцыйны конкурс «DIGI-TALENTV.Lato 2020» у рамках Міжнароднага фестывальнага праекта “Калейдаскоп талентаў” (Польша) дыплом I ступені (ліпень 2020)







Відэакліп мы таксама размясцілі на YouTube канале Цэнтра дзяцей і моладзі. Спасылка: https://www.youtube.com/watch?v=3uf489N7w1w. Таксама выкарысталі гэты відэакліп як відэарад, калі запісвалі выступленне ўзорнай вакальнай студыі для ўдзелу ў абласным этапе VI Рэспубліканскага агляду-конкурсу дзіцячай творчасці “Добры дзень, свет!”. Спасылка: https://www.youtube.com/watch?v=aESQTrDCYso. Гэта адначасова і рэклама дзейнасці нашай студыі і прапаганда народнай песні.

## Заключэнне

Калі патрыятычныя каштоўнасці сфарміраваны, дзіця адчувае гонар за дасягненні сваёй краіны, цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай і працягвае традыцыі сваіх продкаў, прымае актыўны ўдзел у сацыяльна значнай дзейнасці. Сацыяльна значнай дзейнасцю для навучэнцаў вакальнай студыі, ў першую чаргу, з'яўляецца канцэртная дзейнасць, ўдзел у дабрачынных канцэртах-акцыях. Гэта дабрачынныя канцэрты для наведвальнікаў аддзялення дзённага прабывання інвалідаў, цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, навучэнцаў Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната, удзел у канцэртнай праграме для дзяцей і моладзі з абмежаванымі магчымасцямі ў рамках раённага фестывалю "Сонечны круг". Усе лепшыя пачуцці, набытыя навучэнцамі ў працэсе калектыўнай творчай дзейнасці, на кожным занятку, падчас выступленняў у канцэртных праграмах і на разнастайных конкурсах спрыяюць фарміраванню каштоўнасных жыццёвых арыентацый і лепшых агульначалавечых якасцей і пачуццяў. Міласэрнасць і дабрыня, спагадлівасць, узаемадапамога, адказнасць за свае ўчынкі і сумесныя справы калектыва, імкненне прыносіць сваёй творчасцю радасць людзям, любоў да роднай мовы і народнай песні, сваёй сям'і – гэтыя якасці складаюць духоўнае багацце чалавека. А на аснове гэтых агульных для ўсіх пачуццяў фарміруецца і ўмацоўваецца высокае пачуццё любві да Радзімы. І вялікую ролю ў гэтым адыгрывае мастацтва.

Так хочацца спадзявацца, што ў сэрцы кожнага застанецца тое шчымлівае і пяшчотнае пачуццё, якое ўзнікае ў кожнага дарослага чалавека пры выглядзе бацькоўскай хаты. Дзеці яшчэ гэта не ўсведамляюць, але яны хутка зразумеюць, што гэта і ёсць асэнсаванне сябе часцінкай свайго роду, роднай зямлі, што гэта і ёсць самаадданая любоў да Радзімы.

**Літаратура і інфармацыйны рэсурс**

1. Кодекс Республики Беларусь об образовании: Минск: Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2014. – С. 273.
2. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодёжи на 2016 – 2020 годы / Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2016. – № 13. – С.3 – 45.
3. Бедулина, Г.Ф. Формы и методы патриотического воспитания молодёжи /Г.Ф.Бедулина // Праблемы выхавання. – 2010. – №4. – С. 14 – 18.
4. Гражданско-патриотическое воспитание как приоритетное направление воспитания подрастающего поколения: информационно-методический вестник №32 / сост. Н.П. Харитонова, Н.С. Романовская. – Витебск: ГУДО «ВОДДиМ», 2012. – 30 с.
5. Алёхина, Г.И. Патриотическое воспитание средствами вокального искусства [Электронный ресурс] /infourok.ru/patriot

Дадатак 1.

**Пайшла Марта**

*Беларуская народная песня*

Пайшла Марта жыта жаці, ды забула сярпа ўзяці,
Сярпа ўзяла, хлеб забула, вось такая Марта була.
Жаль жа мне не казака, жаль жа мне не яго,
Пратаптала, гоп, чаравічкі, ходзячы да яго.

Пайшла Марта ваду браці, ды забула вёдры ўзяці,
Вёдры ўзяла, коўш забула, бо такая Марта була.
Жаль жа мне не казака, жаль жа мне не яго,
Пратаптала, гоп, чаравічкі, ходзячы да яго.

Пайшла Марта ў лес па дровы, заблудзіла чарнаброва,
Зачапілася за пень, прастаяла цэлы дзень.
Жаль жа мне не казака, жаль жа мне не яго,
Пратаптала, гоп, чаравічкі, ходзячы да яго.

Казаў бацька: “Казу дам і з маленькім казлянём!”,
Казаў бацька: “Дам карову, сватай Марту чарнаброву!”.
Жаль жа мне не казака, жаль жа мне не яго,
Пратаптала, гоп, чаравічкі, ходзячы да яго.